814113
К24

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ
ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА І ЯНКІ КУПАЛЫ

УДК 81-373.23-27(476.2-25)(043.3)

**Карніеўская Таццяна Анатольеўна**

# ІМЕНАСЛОЎ ГОМЕЛЯ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ: ФАРМІРАВАННЕ, ПАХОДЖАННЕ, ФУНКЦЫЯНАВАННЕ

Аўтарэферат дысертацыі на саіскане вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці
10.02.01 – беларуская мова

Навукова-
бібліяграфічны
аддзел

Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М. Машэрава»
НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

Мінск, 2011

S1,411,3-314.031
K24
ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана на кафедры беларускай мовы
УА "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны"

**Навуковы кіраўнік:** **Станкевіч Аляксандра Аляксандраўна,**
доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык кафедры, УА "Гомельскі
дзяржаўны ўніверсітэт імя
Францыска Скарыны",
кафедра беларускай мовы

**Афіцыйныя апаненты:** **Шур Васіль Васільевіч,**
доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык кафедры, УА "Мазырскі
дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя
І.П. Шамякіна",
кафедра беларускага мовазнаўства

**Капылоў Ігар Лявонавіч,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
вучоны сакратар інстытута, ДНУ
"Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба
Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай
акадэміі навук Беларусі"

*20504269*

**Апаніруючая арганізацыя:** УА "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы"

Абарона адбудзецца "20" чэрвеня 2011 года ў 14 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.43.01 пры ДНУ "Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2; тэл. 284-18-85, e-mail: inlinasbel@tut.by).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтарэферат разасланы "20" мая 2011 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат філалагічных навук Н.В. Паляшчук

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Уласнае імя чалавека з'яўляецца своеасаблівым культурным сімвалам, які выконвае адметную функцыю захавання і перадачы нацыянальных традыцый, гісторыі і культуры народа, адлюстроўвае народныя погляды, уяўленні, вераванні, характар і дух народа, кантакты з іншымі этнасамі. Антрапанімічная прастора як сукупнасць уласных імён, якая сфарміравалася ў працэсе гістарычнага развіцця, у кожнага народа мае выразны нацыянальны каларыт.

Асабовае імя заўсёды прыцягвала і прыцягвае ўвагу даследчыкаў. У наш час значную цікавасць уяўляе рэгіянальная антрапанімія – даследаванне іменаслову пэўнага рэгіёна як у сінхранічным, так і дыяхранічным аспектах. У адпаведнасці з гэтым актуальным уяўляецца вывучэнне імён рэгіянальнай лакацыі з мэтай выяўлення іх генетычнай характарыстыкі, шляхоў з'яўлення новых адзінак у іменаслове, прынцыпаў змены антрапанімікону на працягу пэўнага перыяду. Атрыманыя даныя можна разглядаць у параўнанні з іменасловамі гістарычна і геаграфічна блізкіх рэгіёнаў для выяўлення асноўных заканамернасцей іх развіцця.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі.** Дысертацыйная работа выканана на кафедры беларускай мовы ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны" ў рамках тэм "Беларуская навукова-тэхнічная тэрміналогія: генезіс, структура, сістэмныя сувязі і адносіны" (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20013104) і "Беларуская лексікалогія і лексікаграфія на розных этапах развіцця лексіка-семантычнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы" (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20061471), якія ўваходзілі ў ДПФД "Даследаванне беларускай мовы, яе гісторыі, сучаснага стану, сувязей з іншымі славянскімі мовамі; распрацоўка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнага літаратурнага працэсу (Беларуская мова і літаратура)" (2001–2005 гг.), і "Беларуская мова і беларуская літаратура ў гістарычным развіцці і сучасным грамадстве, іх сувязі і ўзаемадзеянне з іншымі мовамі і сусветным літаратурна-мастацкім працэсам (Беларуская мова і літаратура)" (2006–2010 гг.) адпаведна.

**Мэта і задачы даследавання.** Мэтай работы з'яўляецца выяўленне асаблівасцей фарміравання, функцыянавання і паходжання іменаслову г. Гомеля другой паловы XX стагоддзя. Дасягненне пастаўленай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных задач:

1) выявіць асноўныя тэндэнцыі развіцця гомельскага іменаслову другой паловы XX стагоддзя;

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

2) удакладніць перыядызацыю усходнеславянскага іменаслову і гомельскай антрапонімнай сістэмы як яго састаўной часткі;

3) правесці генетычную класіфікацыю гомельскага іменаслову, вылучыць асноўныя працэсы адаптацыі запазычаных онімаў да фанетычных і граматычных асаблівасцей беларускай мовы;

4) выявіць прычыны пашырэння актыўнага антрапанімікону г. Гомеля другой паловы XX стагоддзя, вылучыць яго нацыянальныя адметнасці.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца іменаслоўная сістэма г. Гомеля (уласныя імёны) за перыяд з 1951 па 2000 гады як найбольш актыўнага перыяду ў развіцці антрапанімікі. Усяго прааналізавана 37208 антрапонімаў носьбітаў мужчынскага полу і 35175 антрапонімаў носьбітаў жаночага полу. **Прадмет даследавання** – паходжанне імён актыўнага іменаслову г. Гомеля, іх варыянтнасць, частотнасць ужывання, нацыянальныя адметнасці, змены ў складзе асноўных груп іменаслову.

Выбар аб'екта і прадмета даследавання абумоўлены актуальнасцю вывучэння рэгіянальнай, у тым ліку афіцыйна зарэгістраванай антрапаніміі.

Асноўным **матэрыялам** даследавання з'явіліся спісы нованароджаных г. Гомеля, змешчаныя ў кнігах запісу актаў грамадзянскага стану, якія захоўваюцца ў архівах органаў ЗАГС Чыгуначнага і Цэнтральнага раёнаў. У выніку аналізу 72383 актавых запісаў з 1951 па 2000 гг. зроблены колькасныя падлікі, якія ўтрымліваюць звесткі пра склад і зменлівасць гомельскага антрапанімікону другой паловы XX стагоддзя. Даныя збіраліся метадам суцэльнай выбаркі, г.зн. аналізаваліся ўсе зарэгістраваныя факты іменавання, што дазваляе найбольш поўна адлюстраваць стан і дынаміку лакальнага антрапанімікону. Для сістэмнага выкладу асаблівасцей станаўлення і развіцця гомельскага іменаслову прыводзіліся звесткі з антрапаніміконаў папярэдніх перыядаў яго развіцця.

Напісанне асабовых імён падаецца ў адпаведнасці з "Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі", якія ўступілі ў дзеянне з 1 верасня 2010 года. Пры неабходнасці разгляду рускамоўнага варыянта такая адзінка падаецца ў квадратных дужках.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Сучасны гомельскі іменаслоў з пункту погляду агульнага саставу антрапанімікону, складу груп папулярнасці, колькасці адзінак у актыўным ужытку значна адрозніваецца ад іменаслову папярэдніх этапаў свайго развіцця. Пашырэнне спісу актыўнага антрапанімікону адбываецца перш за ўсё за конт павелічэння адзінкавых онімаў, а таксама імён, якія

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ
знаходзяцца ніжэй за каэфіцыент папулярнасці. Ядро антрапонімнай сістэмы, т.зв. скразныя імёны, захоўваецца на працягу даволі значнага гістарычнага часу.

2. Развіццё гомельскага іменаслову адпавядае асноўным напрамкам змен ва ўсходнеславянскай антрапонімнай сістэме, звесткі аб гістарычнай эвалюцыі гомельскага іменаслову супадаюць з вызначальнымі тэндэнцыямі гэтай сістэмы і сваімі фактамі пацвярджаюць, што ён з'яўляецца неад'емнай часткай беларускага, а ў больш шырокім разуменні, і ўсходнеславянскага іменаслову .

3. У сувязі з запазычваннем вялікай колькасці новых, нетрадыцыйных для беларускага іменаслову намінатыўных адзінак генетычны падзел імён неабходна праводзіць у адпаведнасці з класіфікацыяй моў свету, вызначаючы мову паходжання першаснай формы і мову бытавання кожнага варыянта, пры гэтым паняцці "кананічнае" – "некананічнае" становяцца другаснымі.

4. Спецыфіка сучаснага гомельскага іменаслову ў параўнанні з папярэднімі гістарычнымі перыядамі заключаецца ў своеасаблівым працэсе вяртання да вытокаў, імкненні пашырыць актыўны антрапанімікон за кошт т. зв. старых, кананічных імён, увядзення ў якасці афіцыйных народных формаў антрапонімаў, а таксама за кошт ужывання імён са славянскімі асновамі. Такі сінтэз нацыянальнага і рэлігійнага фактараў спрыяе станаўленню нацыянальнай самаідэнтыфікацыі носьбітаў і намінатараў гомельскага антрапанімікону.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Дысертацыя – вынік самастойнага даследавання саіскальніка. У працы выкладзены вынікі ўласных назіранняў на аснове аналізу і сістэматызацыі фактычнага матэрыялу, сабранага асабіста аўтарам. Усе надрукаваныя работы выкананы без суаўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Вынікі даследавання прайшлі апрабацыю на наступных канферэнцыях: VIII студэнцкая навуковая канферэнцыя "Студенческая наука на пороге III тысячелетия" (Мазыр, 18–19 красавіка 2001 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя "Актуальные вопросы славянской ономастики" (Гомель, 21–22 лістапада 2002 г.); IX Рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў Рэспублікі Беларусь "НИРС–2004" (Гродна, 23–24 красавіка 2004 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя "Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся" (Гомель, 20–21 мая 2004 г.); Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Тураўскія чытанні" (Гомель, 4 верасня 2004 г.); III Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння прафесара У.В. Анічэнкі

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

"Скарына і наш час" (Гомель, 7 кастрычніка 2004 г.); Міжнародная навукова-метадычная канферэнцыя "Праблемы развіцця, функцыянавання і нармавання лексікі беларускай мовы" (Гомель, 22–23 кастрычніка 2004 г.); II Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах" (Гомель, 11–12 лістапада 2004 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя "VII Навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу" (Гомель, 27 мая 2005 г.); III Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах" (Гомель, 22–23 кастрычніка 2006 г.); III Міжнародная навукова-метадычная канферэнцыя "Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования" (Брэст, 22 -23 лістапада 2007 г.); IV Міжнародная навуковая канферэнцыя "Скарына і наш час" (Гомель, 13–14 лістапада 2008 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларуская анамастыка. Гісторыя і сучаснасць" (Мінск, 20 красавіка 2010 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 24 публікацыях, у ліку якіх 1 манаграфія (6,2 аўт. арк.), 6 навуковых артыкулаў у выданнях, якія ўключаны ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (2,0 аўт. арк.), 4 артыкулы ў зборніках навуковых прац (0,75 аўт. арк.), 13 матэрыялаў і тэзісаў навуковых канферэнцый (2,25 аўт. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў – 11,2 аўт. арк. Усе публікацыі выкананы саіскальнікам без суаўтараў.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца са спіса ўмоўных скарачэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (213 пазіцый) і спіс публікацый саіскальніка (24 пазіцыі). Дысертацыя мае 7 дадаткаў: А) "Паходжанне імён гомельскага іменаслову"; Б) "Іменаслоўныя сістэмы Беларусі XX стагоддзя"; В) "Пагадовыя паказчыкі гомельскага іменаслову другой паловы XX стагоддзя"; Г) "Імёны, нададзеныя ў неславянскіх і змешаных сем'ях"; Д) "Змены ўжывальнасці адзінак гомельскага антрапанімікону другой паловы XX стагоддзя"; Е) "Колькасныя паказчыкі іменаслову г. Гомеля за перыяд з 1951 па 2000 гады"; Ж) "Акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання".

Агульны аб'ём дысертацыі складае 171 старонку, у тым ліку асноўны тэкст – 108 старонак, які ўключае 7 табліц аб'ёмам 3 старонкі, бібліяграфічны спіс займае 18 старонак, 7 дадаткаў – 45 старонак.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваюцца выбар тэмы работы і яе актуальнасць, адзначаецца ступень распрацаванасці пытанняў вывучэння беларускай антрапаніміі, вызначаецца тэарэтычная і практычная значнасць даследавання.

У **агульнай характарыстыцы работы** фармулююцца мэта, задачы, аб’ект і прадмет даследавання, асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, асабісты ўклад саіскальніка, апрабацыя вынікаў работы, прыводзяцца звесткі пра апублікаванасць вынікаў дысертацыі, яе структуру і аб’ём.

**Першая глава “Асабовае імя як сацыялінгвістычная адзінка”** носіць аглядава-аналітычны характар і складаецца з чатырох раздзелаў.

<u>У першым раздзеле</u> “Асноўныя напрамкі даследаванняў ва ўсходнеславянскай антрапаніміцы” разглядаецца храналогія прац па антрапаніміцы, пачынаючы ад адзінкавых даследаванняў перыяду Сярэдневякоўя і заканчваючы фарміраваннем беларускай антрапанімічнай школы і сучаснымі міжнароднымі канферэнцыямі па анамастыцы пачатку ХХ стагоддзя.

Беларуская антрапанімія пачала грунтоўна даследавацца толькі ў сярэдзіне 60-х гг. ХХ стагоддзя. Дасягненні ў гэтай галіне звязаны ў першую чаргу з імем вядомага беларускага антрапаніміста М.В. Бірылы. Пераломнымі ў якасным развіцці беларускай антрапанімікі з’яўляюцца 70–80-я гг. ХХ стагоддзя. У гэты перыяд яна ўзнімаецца на прынцыпова новы навуковы ўзровень, складваецца як самастойная навука. 80-я і 90-я гг. у беларускай лінгвістыцы вызначаюцца актывізацыяй даследаванняў у розных галінах анамастыкі. Паколькі вывучэнне ўласных імён мае важнае значэнне не толькі для мовазнаўчай навукі, але і для шырокага пазнання матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, даследаванне беларускай антрапаніміі, у прыватнасці, рэгіянальнай, набывае асаблівую актуальнасць (працы Г.К. Усціновіч, Г.К. Семяньковай, В.М. Ляшкевіч, Т.У. Скрабнёвай).

<u>У другім раздзеле</u> “Развіццё тэорыі ўласнага імя” разглядаюцца асноўныя аспекты фарміравання тэорыі антрапоніма як сацыялінгвістычнай адзінкі. Антрапонімы ўяўляюць сабой не толькі надзвычай вялікую, функцыянальна і сацыяльна значную і маркіраваную ў культурна-гістарычным плане частку слоўніка любой мовы, але і вельмі адметны паводле спецыфічна лінгвістычных параметраў (семантыкі, фанетыкі, арфаграфіі, словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу) лексічны пласт, паколькі яны функцыянуюць ва ўсіх галінах чалавечай дзейнасці, у

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ
палітычных і гістарычных прычынах складаецца ў асноўным з запазычаных імён, таму заканамерным з'яўляецца вызначэнне паходжання онімаў. У класічнай антрапаніміцы асноўным паказчыкам для вызначэння генетычнай класіфікацыі антрапонімаў з'яўляецца паняцце кананічнага-некананічнага імя з наступнай канкрэтызацыяй мовы паходжання. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што ўсходнеславянскі іменаслоў доўгі час развіваўся пад уплывам пашырэння хрысціянства, якое аказвала і працягвае аказваць уплыў на розныя бакі жыцця грамадства, таму што на працягу дзесяці стагоддзяў амаль адзіным афіцыйным пісьмовым дакументам, дзе фіксаваліся імёны, з'яўляліся святцы. Пры аналізе сучаснага іменаслову такая класіфікацыя становіцца яўна недастатковай. Прычынай гэтаму стала пранікненне ў наш антрапанімікон онімаў, якія аказваюцца за яго межамі. У гомельскім іменаслове канца XX стагоддзя адзначаецца значная колькасць новых запазычанняў, шматлікіх заходнееўрапейскіх варыянтаў, зарэгістраваных у якасці афіцыйных формаў. Таму больш лагічнай становіцца класіфікацыя онімных адзінак сучаснага іменаслову згодна з класіфікацыяй моў свету (імёны балтыйскай групы *Андрус, Арвідас, Вітаўтас*, арабскія антрапонімы *Амары, Джамал, Магамед*, цюркскія *Айдар, Чынгіз*). Пры гэтым улічваецца не толькі мова паходжання імя, але і мова існавання дадзенага варыянта (напрыклад, *Іаан* – кананічная старажытнаяўрэйская форма, *Іван* – усходнеславянскі варыянт, *Жан* – французскі варыянт і г.д.) [1, с. 37–47; 4; 5; 10; 12; 13; 19; 20; 22; 24].

4. Для іменаслову г. Гомеля другой паловы XX стагоддзя (асабліва апошняй яго трэці) з'яўляецца характэрным пашырэнне актыўнай яго часткі за кошт наступных тэндэнцый: 1) з'яўленне спецыфічна беларускіх формаў імён, якія зарэгістраваны ў якасці афіцыйных (*Алесь, Алеся, Габрэля, Лявона*); 2) вяртанне ва ўжытак кананічных онімаў і іх формаў, якія адзначаюцца носьбітамі як старыя (*Арыстарх, Аўдзей, Іаан, Кліменцій, Сергій, Фрол, Арына, Стафанія*); 3) стварэнне наватвораў (часцей двухасноўных) са славянскімі асновамі ці запазычванне антрапонімаў з іншых славянскіх моў (*Радзіслаў, Таміслаў, Уласціслаў, Весціслава, Міраслава, Славяна, Яраслава*). Такім чынам, у сучасным гомельскім іменаслове адбываецца працэс, які можна назваць вяртаннем да вытокаў, г.зн. наміначары і носьбіты антрапонімаў імкнуцца да ўзнаўлення і выкарыстання імён, якія адзначаліся ў іменасловах папярэдніх эпох, свядома ці падсвядома лічачы гэтыя онімы самабытнымі, характэрнымі для беларускага менталітэту. Такія беларускія формы антрапонімаў, старыя кананічныя імёны і онімы са славянскімі асновамі не толькі робяць

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

іменаслоў больш разнастайным, але і з'яўляюцца адметнасцю нацыянальнай антрапанімії [1, с. 55–81; 2; 3; 9; 14; 15; 16; 21; 24].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

1. Асноўныя палажэнні і вынікі працы будуць садзейнічаць далейшаму развіццю антрапанімікі, этналінгвістыкі і лексікалогіі.

2. Вынікі дысертацыйнага даследавання па выяўленні асноўных заканамернасцей развіцця гомельскага іменаслову з'яўляюцца дапаўненнем да матэрыялаў аналізу тапонімнай (гідронімы, айконімы, этнонімы) і антрапонімнай (прозвішчы, мянушкі) лексікі азначанага рэгіёна. Атрыманыя звесткі могуць быць выкарыстаны пры ўкладанні слоўніка беларускіх асабовых імён, онімнага даведніка гомельскага рэгіёна, а таксама як матэрыял для вывучэння духоўнай культуры беларусаў. У перспектыве пры выяўленні асаблівасцей афіцыйных іменаслоўных сістэм іншых рэгіёнаў Беларусі матэрыялы могуць быць выкарыстаны для стварэння спецыяльнага даведніка па антрапонімнай прасторы рэспублікі.

3. Матэрыял дысертацыі можа быць выкарыстаны пры выпрацоўцы правіл аднастайнай перадачы антрапонімаў іншамоўнага паходжання на беларускую мову, што з'яўляецца адной з важнейшых задач у сучаснай лінгвістыцы.

4. Вынікі і матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы і выкладанні курсаў лексікалогіі, анамастыкі, лінгвакультуралогіі, спецкурсаў і спецсемінараў, прысвечаных праблемам станаўлення антрапонімнай сістэмы Гомельшчыны. Матэрыял дысертацыі будзе карысным пры напісанні курсавых, дыпломных, магістарскіх і кандыдацкіх работ студэнтамі, магістрантамі і аспірантамі-філолагамі. Да работы дадаецца акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ў сістэме сярэдняй адукацыі на факультатыўных занятках і ў навукова-даследчай рабоце навучэнцаў (дадатак Ж дысертацыі).

Асноўныя вывады дысертацыі адлюстраваны ў наступных публікацыях:

### Манаграфія

1. Карніеўская, Т.А. Іменаслоў горада Гомеля другой паловы XX стагоддзя : манаграфія / Т.А. Карніеўская ; М-ва адукацыі РБ, Гомел. дзярж. ун-т. – Гомель, 2010. – 168 с.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## Артыкулы ў рэцэнзуемых перыядычных выданнях

2. Карнієўская, Т.А. Іменаслоў Гомельшчыны: сацыялінгвістычны аналіз / Т.А. Карнієўская // Изв. Гомел. гос. ун-та. – 2002. – № 1(26). – С. 90–94.

3. Карнієўская, Т.А. Іменаслоў як лінгвістычна-грамадская з'ява / Т.А. Карнієўская // Изв. Гомел. гос. ун-та. – 2003. – № 1 (27). – С. 66-70.

4. Карнієўская, Т.А. Структурна-семантычны аналіз уласных імёнаў старажытнагрэчаскага і лацінскага паходжання / Т.А. Карнієўская // Изв. Гомел. гос. ун-та. – 2005. – № 1 (28). – С. 67–72.

5. Карнієўская, Т.А. Этымалагічная класіфікацыя гомельскага іменаслову другой паловы XX стагоддзя / Т.А. Карнієўская // Изв. Гомел. гос. ун-та. – 2007. – № 4 (43). – С. 68–73.

6. Карнієўская, Т.А. Іменаслоўная сістэма горада Гомеля перыяду 1981–1990 гадоў / Т.А. Карнієўская // Весн. Брэсц. дзярж. ун-та. Літаратуразнаўства. Мовазнаўства. – 2009. – № 1 (11). – С. 172–181.

7. Карнієўская, Т.А. Аналіз уласных імён старажытнаяўрэйскага паходжання як складаючай беларускага іменаслову / Т.А. Карнієўская // Изв. Гомел. гос. ун-та. – 2010. – № 4 (61). – С. 66–71.

## Артыкулы ў зборніках навуковых прац

8. Карнієўская, Т.А. Уласныя імёны Гомельшчыны: стратыграфічны аналіз / Т.А. Карнієўская // Творчество молодых 2001 : сб. науч. работ студентов и аспирантов ГГУ / Гомел. гос. ун-т ; под ред. Д.Г. Лина. – Гомель, 2001. – С. 95–97.

9. Карнієўская, Т.А. Нацыянальнае ў беларускім іменаслове / Т.А. Карнієўская // Творчество молодых 2003 : сб. науч. работ студентов и аспирантов ГГУ / Гомел. гос. ун-т ; под ред. Д.Г. Лина. – Гомель, 2003. – С. 263–265.

10. Карнієўская, Т.А. Да пытання аб этымалагічнай класіфікацыі ўласных імёнаў / Т.А. Карнієўская // Слово в культуре : сб. науч. ст. : в 2 ч. / Гомел. гос. ун-т ; под общ. ред. Л.С. Банниковой, В.И. Коваля. – Гомель, 2004. – Ч. 1. – С. 48–51.

11. Карнієўская, Т.А. Асноўныя паказчыкі гомельскага антрапанімікону 70-х гадоў XX стагоддзя / Т.А. Карнієўская // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі РБ, Гомел. дзярж. ун-т ; рэдкал. : А.А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2009. – С. 130–132.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


12. Карніеўская, Т.А. Прапрыяльная лексіка беларускай мовы: генезіс, функцыянаванне, развіццё / Т.А. Карніеўская // Студенческая наука на пороге III тысячелетия : материалы докл. и сообщ. VIII студ. науч. конф., Мозырь, 18–19 апр. 2001 г. : в 2-х ч. / Мозыр. гос. пед. ин-т ; под ред. В.В. Валетова. – Мозырь, 2001. – Ч. 1. – С. 186–187.

13. Карніеўская, Т.А. Імя як соцыякультурны сімвал / Т.А. Карніеўская // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы Междунар. науч. конф., Гомель, 21–22 нояб. 2002 года / Гомел. гос. ун-т ; редкол. : Р.М. Козлова (отв. ред.) [и др.]. – Гомель, 2002. – С.107–111.

14. Карніеўская, Т.А. З'ява варыянтнасці ў беларускім іменаслове / Т.А. Карніеўская // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гомель, 20–21 мая 2004 г. : у 2-х ч. / Гомел. дзярж. ун-т ; пад рэд. А.А. Станкевіч. – Гомель, 2004. – Ч. 2. – С. 90–92.

15. Карніеўская, Т.А. Лінгвістычныя і сацыяльныя аспекты ў антрапаніміцы / Т.А. Карніеўская // IX Респ. науч. конф. студентов и аспирантов Республики Беларусь "НИРС-2004" : тез. докл., Гродно, 26–27 мая 2004 г. : в 8 ч. / Гродн. гос. ун-т ; под ред. А.И. Жука. – Гродно, 2004. – Ч. 4. – С. 123–125.

16. Карніеўская, Т.А. Антрапанімікон Гомеля: стратыграфія і этымалогія / Т.А. Карніеўская // Тураўскія чытанні : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Гомель, 4 верас. 2004 г. / НАН Беларусі, Гомел. дзярж. ун-т ; рэдкал. : У.І. Коваль [і інш.]. – Гомель, 2005. – С. 70–75.

17. Карніеўская, Т.А. Прымяненне колькасна-якаснага метаду ў антрапаніміцы / Т.А. Карніеўская // Скарына і наш час : матэрыялы III Міжнар. навук. канф., прысвеч. 80-годдзю з дня нараджэння праф. У.В. Анічэнкі, Гомель, 7 кастр. 2004 г. / Гомел. дзярж. ун-т ; рэдкал. : А.А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2004. – С. 251–256.

18. Карніеўская, Т.А. Да вызначэння сутнасці асабовага імя / Т.А. Карніеўская // Праблемы развіцця, функцыянавання і нармавання лексікі беларускай мовы : матэрыялы Міжнар. навук.-метад. канф., Гомель, 22–23 кастр. 2004 г. / Гомел. дзярж. ун-т, НДІ гіст. і культ. усходнеслав. народаў; рэдкал. : Д.Д. Паўлавец [і інш.]. – Гомель, 2004. – С. 122–125.

19. Карніеўская, Т.А. Нетрадыцыйныя антрапонімы ў гомельскім іменаслове / Т.А. Карніеўская // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы II Междунар. науч. конф. "Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах", Гомель, 11–

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ
12 нояб. 2004 г. / Гомел. гос. ун-т ; отв. ред. Р.М. Козлова. – Гомель, 2004. – С. 76–86.

20. Карніеўская, Т.А. Месца старажытнаяўрэйскіх онімаў ва ўсходнеславянскім іменаслове / Т.А. Карніеўская // VII Навуковыя чытанні, прысвеч. С. Некрашэвічу : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гомель, 27 мая 2005 г. / М-ва адук. РБ, Гомел. дзярж. ун-т ; рэдкал. : А.А. Станкевіч [і інш.]. – Гомель, 2005. – С. 86–89.

21. Карніеўская, Т.А. Асаблівасці іменаслову Гомеля перыяду 1991–2000 гг. / Т.А. Карніеўская // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы III Междунар. науч. конф. "Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах", Гомель, 6–7 октяб. 2006 г. / Гомел. гос. ун-т ; редкол. : Р.М. Козлова (отв. ред.) [и др.]. – Гомель, 2006. – С. 85–92.

22. Карніеўская, Т.А. Славянскія імёны ў гомельскім іменаслове / Т.А. Карніеўская // Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : материалы III Междунар. науч.-метод. конф., Брест, 22–23 нояб. 2007 г. / Брест. гос. ун-т ; редкол. : Е.И. Абрамова [и др.]. – Брест, 2008. – С. 222–224.

23. Карніеўская, Т.А. Асноўныя рысы гомельскага антрапанімікону 60-х гг. XX стагоддзя / Т.А. Карніеўская // "Скарына і наш час" : матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., Гомель, 13–14 лістап. 2008 г. : у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т ; рэдкал. А.А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2008. – Ч. 1. – С. 260–266.

24. Карніеўская, Т.А. Іменаслоў горада Гомеля другой паловы XX стагоддзя / Т.А. Карніеўская // Беларуская анамастыка. Гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 20 крас. 2010 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: І.Л. Капылоў [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 150–154.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

РЭЗЮМЭ

Карніеўская Таццяна Анатольеўна

# ІМЕНАСЛОЎ ГОМЕЛЯ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ: ФАРМІРАВАННЕ, ПАХОДЖАННЕ, ФУНКЦЫЯНАВАННЕ

**Ключавыя словы:** адзінкавае імя, антрапонім, антрапанімія, варыянтнасць, жаночае імя, запазычанае імя, іменаслоў, мужчынскае імя, онім, славянскае імя, уласнае імя, частотнасць, этымалогія.

**Мэта даследавання**: выявіць асаблівасці фарміравання, функцыянавання і паходжання іменаслову г. Гомеля другой паловы XX стагоддзя.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца іменаслоўная сістэма г. Гомеля (уласныя імёны) за перыяд з 1951 па 2000 гады.

**Прадметам даследавання** з'яўляецца паходжанне імён актыўнага іменаслову, іх варыянтнасць, частотнасць ужывання, нацыянальныя адметнасці, змены ў складзе асноўных груп іменаслову.

**Метады даследавання:** апісальны, параўнальны, параўнальна-гістарычны, структурны, колькасныя падлікі.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Упершыню вызначаны асаблівасці фарміравання і функцыянавання афіцыйнага гомельскага антрапанімікону другой паловы XX стагоддзя; удакладнена перыядызацыя ўсходнеславянскага антрапанімікону; праведзены генетычны падзел гомельскага іменаслову; выяўлены асаблівасці складу сучаснага антрапанімікону г. Гомеля.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Асноўныя палажэнні і вынікі працы будуць садзейнічаць развіццю антрапанімікі ў цэлым і яе сацыялінгвістычнага аспекту, у прыватнасці; могуць служыць асновай пры складанні слоўніка асабовых імён Гомеля; выкарыстоўвацца падчас распрацоўкі тэарэтычных пытанняў антрапанімікі, а таксама пры распрацоўцы і выкладанні курсаў лексікалогіі, спецкурсаў, прысвечаных праблемам функцыянавання антрапаніміі. Матэрыялы дысертацыі могуць быць прыменены ў педагагічнай практыцы, будуць карыснымі пры напісанні курсавых, дыпломных, магістарскіх і кандыдацкіх работ студэнтамі, магістрантамі і аспірантамі-філолагамі.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

РЕЗЮМЕ

Корниевская Татьяна Анатольевна

# ИМЕННИК ГОМЕЛЯ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XX ВЕКА: ФОРМИРОВАНИЕ, ПРОИСХОЖДЕНИЕ, ФУНКЦИОНИРОВАНИЕ

**Ключевые слова:** антропоним, антропонимия, вариантность, единичное имя, женское имя, заимствованное имя, именник, имя собственное, мужское имя, оним, славянское имя, частотность, этимология.

**Цель исследования:** выяснение особенностей формирования, функционирования и происхождения именника г. Гомеля второй половины XX века.

**Объектом исследования** является система личных имён города Гомеля за период с 1951 по 2000 годы.

**Предметом исследования** является происхождение имён активного именника, их вариантность, частотность употребления, национальные особенности, изменения в составе групп именника.

**Методы исследования:** описательный, сравнительный, сравнительно-исторический, структурный, количественные подсчёты.

**Научная новизна и значимость полученных результатов.** Впервые определены особенности формирования и функционирования гомельского антропонимикона второй половины XX века; уточнена периодизация восточнославянского именника; проведена генетическая классификация гомельского именника; выявлены особенности современного антропонимикона г. Гомеля.

**Практическая значимость полученных результатов.** Основные положения и результаты работы будут содействовать развитию антропонимики в целом и ее социолингвистического аспекта, в частности; могут служить основой при составлении словаря личных имён Гомеля; использоваться при разработке теоретических вопросов антропонимики, при разработке и преподавании курсов лексикологии, спецкурсов, посвящённых проблемам функционирования антропонимии. Материалы диссертации могут быть использованы в педагогической практике, будут полезными при написании курсовых, дипломных, магистерских и кандидатских работ студентами, магистрантами и аспирантами-филологами.



*20504269*

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## SUMMARY

Karniyeuskaya Tatsiana Anatolievna

# THE SYSTEM OF THE NAMES OF GOMEL OF SECOND HALF XX CENTURY: SHAPING, ORIGIN, FUNCTIONING

**Key words:** anthroponym, etymology, feminine name, frequency, male name, onym, proper name, single name, slavonic name, system of the anthroponyms, system of the names, unoriginal name, variant.

**The purpose of the research** is a clarification of shaping, operation and origin of the system of the personal names of Gomel of second half XX century.

**The object of the research** is the system of the personal names of Gomel 1951–2000 years.

**The subject of the research** is etymology of the names active, variants, frequency, national particularities, changes to composition of the main groups of the system of the names.

**The methods of the research:** descriptive, comparative, comparative historical, structural, quantitative.

**The scientifical novelty of the research**. The particularities of the shaping and operating of the system of the personal names of Gomel of II half XX century were determined for the first time; the period of the system Slavonic development of the names were made more precise the genetic categorization of the system of the personal names of Gomel; the particularities of the system of the anthroponyms of Gomel were reveallcd.

**The practical value of the research.** The main aspects and results of the research are contribution to the development of study of personal names and her sociolinguistic aspect in particular. The dissertation results can be served as the base for the formation of the dictionary of the personal names of Gomel; they can be used for the development of theoretical questions of the anthroponyms; can be used for preparing textbooks and reference books, as well as for development and teaching course to lexicology, study courses, devoted to the problem of the functioning of the system of names. The conclusions and the received results received can be used in lexicographical practice, the material of the research study will be useful for writing course papers, Master-degree papers and candidate's work by students and graduate student-philologists.



1000 с

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

*Навуковае выданне*

**КАРНІЕЎСКАЯ** Таццяна Анатольеўна

**ІМЕНАСЛОЎ ГОМЕЛЯ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ: ФАРМІРАВАННЕ, ПАХОДЖАННЕ, ФУНКЦЫЯНАВАННЕ**

Спецыяльнасць 10.02.01 – «Беларуская мова»

Аўтарэферат дысертацыі на саіскание вучонай ступені кандыдата філалагічных навук

Подписано в печать 18.05.2011. Формат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Бумага офсетная. Ризография. Усл. печ. л. 1,4.
Уч.-изд. л. 1,52. Тираж 60 экз. Заказ № 312.

Издатель и полиграфическое исполнение:
Учреждение образования
«Гомельский государственный университет
имени Франциска Скорины»
ЛИ № 02330/0549481 от 14.05.2009.
Ул. Советская, 104, 246019, Гомель